«Чацвёртая планета» не акрыліла

СТАР. 5

Патэнцыйныя «Міс Беларусь»

СТАР. 8

Вясна ў краіне пірамід

СТАР. 10

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

14 КРАСАВІКА 2018 г. СУБОТА № 72 (28688)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

БОЛЬШ, ЧЫМ СПАРТЫЎНЫ ІНТАРЭС

Фота БелТА.

Учора Прэзідэнт Беларусі, Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях развіцця зімовых відаў спорту. У час зацікаўленай размовы абмеркавалі іх сённяшні стан з улікам вынікаў Алімпійскіх гульняў у Пхёнчхане, а таксама заглянулі на чатыры гады наперад — як мы зможам прадставіць краіну на зімовых Гульнях у Пекіне.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў ролю спорту не толькі для здароўя людзей, але і ў якасці прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі. «Калі гаварыць аб зімовых відах, то ў кожным рэгіёне ёсць лядовыя арэны, пабудавана па некалькі трас, якія зімой выкарыстоўваюцца для лыжных гонак, летам — для лыжароллераў. Дадзены даручэнні аб будаўніцтве ўсесезонных аб'ектаў для лыжных трэніровак у Раўбічах і Мінску», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аднак на зімовых Гульнях-2018 нашы спартсмены заваявалі толькі тры медалі. «Гэта вынік сур'ёзных праблем у рабоце ўсёй спартыўнай галіны», — лічыць кіраўнік дзяржавы. На спаборніцтва такога ўзроўню едуць не проста выступаць, а перамагаць. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што «не ўсе нашы прадстаўнікі паказалі рэзультаты, якія мы мелі права ад іх чакаць». Напрыклад, хакеісты ўвогуле не трапілі на Алімпіяду, праваліўшы другую запар кваліфікацыю. У мужчынскім біятлоне вынікі засмучальныя, у жаночым — не бачна, хто прыйдзе на змену Дар'і Домрачавай і Надзеі Скардзіна. Прэзідэнт папрасіў даць прынцыповую ацэнку развіццю зімовых відаў спорту ў Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што спорт — гэта «кроўная справа» губернатараў. Нездарма прадстаўнікі ўсіх абласканкамаў і сталічнага гарвыканкама ўдзельнічалі ў нарадзе. Міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук адзначыў, што пытанне вынікаў будзе стаяць, пакуль мы не зменім свае адносіны да спорту і не выбудуем дакладную сістэму планавання і забеспячэння кіравання ад міністэрства да кожнага раёна. Да ліпеня плануецца завяршыць стварэнне самастойных падраздзяленняў спорту на ўзроўні раёнаў. У верасні на базе Віцебскага рэгіёна мяркуецца правядзенне семінара па зімовых відах спорту: сабраць спецыялістаў з усёй краіны і ацаніць гатоўнасць да новага сезона.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў падрыхтоўцы маладых павінны актыўна ўдзельнічаць былыя спартсмены, якія ведаюць гэту справу як ніхто. Зараз для юных талентаў існуюць магчымасці праявіць сябе. Гэта і «Снежны снайпер» па біятлоне, і «Залатая шайба» па хакеі.

Пры гэтым, гаворачы пра хакей, Прэзідэнт дакладна адзначыў, што «шалёных грошай не будзе, будзем плаціць за вынік», і без яго заробкі большымі, чым у мінулым сезоне, не атрымаюць. Важны момант у развіцці айчыннага спорту — свае спаборніцтвы, бо без гэтага, як сказаў Аляксандр Лукашэнка, перспектывы не будзе.

Першы віце-прэзідэнт НАК Андрэй Асташэвіч расказаў, што апошнім часам намецілася развіццё кёрлінга ў краіне. Пры тым, што ў нас дастаткова магчымасцяў, каб ён стаў масавым. На сёння гэты від спорту развіваецца толькі ў сталіцы і Мінскай вобласці, заняткі праходзяць на канькабежным стадыёне «Мінск-Арэны». Таксама Андрэй Асташэвіч прапанаваў павялічыць адказнасць федэрацый за дасягненне планаваных вынікаў.

Гаворачы пра біятлон, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што «мы не можам страціць гэты від спорту», а таксама спытаў у старшыні Беларускай федэрацыі біятлона Андрыяна Цыбульскага, чаму на Алімпіядзе спартсмены выступілі не на належным узроўні. Старшыня адказаў, што сёлета сітуацыя па мужчынскім біятлоне павінна выправіцца.

СТАР. 2

Гаспадыня казачнага горада

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Маленькая жыхарка вёскі Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна Ганна ЛОСІК ганарыцца незвычайным падарункам. Калі дзяўчынка нарадзілася, а гэта было сем гадоў таму, яе дзядуля, Эдуард Аляксандравіч ШАЛЬКЕВІЧ, у гонар унучкі пабудаваў на сваім падворку сапраўдны комплекс казачнай архітэктуры, толькі мініяцюрны.

ЦЫТАТА ДНЯ

Станіслаў ЗАСЬ, дзяржаўны сакратар Савета бяспекі:

«Праверка боегатоўнасці Узброеных Сіл, якую Дзяржаўны сакратарыят Савета бяспекі праводзіць у адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта краіны і якая ахоплівае найбольш важныя пытанні баявой гатоўнасці і паўсядзённай дзейнасці беларускай арміі, завяршаецца. Трэба сказаць, што ўсе задачы, якія планаваліся на гэтую праверку, адпрацаваны. Усе задачы вырашаны Узброенымі Сіламі. Нейкіх правалаў або зрываў у выкананні задач не дапушчана».

■ З першых вуснаў

ДЫПЛАМАТЫЯ ШЫРОКАГА СПЕКТРА

Гутарка з Паўлам ЛАТУШКАМ — пра мастацтва, дыпламатыю і дыверсіфікацыю экспарту

На гэтым тыдні ў сталіцы Партугаліі адкрылася выстаўка «Ад Лісабона праз Мінск, Маскву, Астану да Уладзівастока», адным з ініцыятараў стварэння якой выступіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Францыі Павел Латушка, які таксама прадстаўляе нашу краіну ў Каралеўстве Іспанія, Княстве Манака і Партугальскай Рэспубліцы. Карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з Паўлам Паўлавічам не толькі пра мастацтва, але і пра рэалізацыю беларускіх тавараў і работу айчыннай дыпламатычнай місіі на міжнароднай арэне ўвогуле.

Фота Артура КОФА.

АБ'ЯДНАЦЬ РАЗНАСТАЙНАСЦЮ

— Што ўяўляе сабой выстаўка «Ад Лісабона праз Мінск, Маскву, Астану да Уладзівастока» і што на ёй прадстаўлена?

— Ідэя яе арганізацыі з'явілася ў Год культуры, які праводзіўся ў нашай краіне. І адной з падстаў з'яўлення ідэі стала выказванне вядомага сусветнага палітыка Шарля дэ Голя, былога прэзідэнта Францыі, які ў канцы 50-х гадоў XX стагоддзя ў Страсбургу агучыў тэзіс неабходнасці пабудовы агульнай прасторы без падзяляльных ліній «ад Лісабона да Урала». Пазней у знешняй палітыцы розных краін тэзіс трансфармаваўся ў назву «ад Лісабона да Уладзівастока».

І вось гэта стала падставай для рэалізацыі дадзенага культурнага праекта. Дарэчы, галоўным прынцыпам ЮНЕСКА з'яўляецца разнастайнасць і пабудова праз яе агульнай культурнай прасторы. Мы розныя, мы адрозніваемся адно ад аднаго, але дзякуючы гэтаму ўносім свой уклад у культурную прастору Еўропы і свету, такім чынам яна становіцца багацейшай. Вельмі важна менавіта сёння разумець адно аднаго, бачыць розныя кірункі мастацтва, знаёміцца з яго прадстаўнікамі. Зразумела, што сённяшняя цывілізацыя і дасягненні, якія мы выкарыстоўваем праз інтэрнэт, інфармацыйныя, тэлевізійныя і іншыя тэхналогіі, ствараюць шмат магчымасцяў. Праз арганізацыю выстаўкі, у якой прынялі ўдзел 30 мастакоў з 28 краін Еўропы і Азіі, мы стварылі ўнікальную магчымасць менавіта ў рэальным вымярэнні пазнаёміцца з сучасным выяўленчым мастацтвам.

— Як гэта выстаўка будзе развівацца ў будучыні?

— Дарэчы, цікава, што гэты праект пашырыўся і пасля адкрыцця ў 2016 годзе ў Мінску, а потым — у Маскве і Астане, да яго далучыліся прадстаўнікі і іншых краін. Напрыклад, Швецыя і Ізраіль, а Кітай выказаў пажаданне прыняць удзел. Гэта з'яўляецца сведчаннем таго, што падобная аб'яднаўчая ідэя запатрабавана, неабходнасць яе рэалізацыі — безумоўная. Важна, што праект падтрымала Міністэрства замежных спраў Беларусі, беларускія пасольствы, Мінгарвыканкам і Музей гісторыі горада Мінска. Усё ж такі, цэнтральны пункт выстаўкі — сталіца нашай дзяржавы, якая апошнім часам адыгрывае вельмі важную ролю гледзішча будаўніцтва рэгіянальнай стабільнасці. Праект падтрыманы і ЮНЕСКА, якая ўзяла патранат над яго рэалізацыяй.

Лічу, што выстаўка мае свае перспектывы, магчымасць аднаўлення і рэалізацыі ў будучыні. Гэта можа быць не толькі выяўленчае мастацтва, але і музыка, тэатр, кіно, магчымы ўдзел прадстаўнікоў розных сфер, праз вынікі працы якіх мы зможам пабудаваць агульную прастору.

СТАР. 2

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

БРЫТАНІЯ ПРАВЯЛА МАШТАБНУЮ КІБЕРАТАКУ СУПРАЦЬ «ІСЛАМСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ»

Атака была накіравана на дыскаардынацыю тэрарыстычнай групоўкі, паведамілі ў Цэнтры ўрадавай сувязі Вялікабрытаніі (Government Communications Headquarters, GCHQ). Кіраўнік цэнтра, былы агент MI-5 Джэрэмі Флемінг заявіў, што ў выніку экстрэмістам будзе складаней планаваць будучыя напады. Гэта першы ў гісторыі Брытаніі выпадак поўнамаштабнага выкарыстання кібератакі ў ходзе ваеннай кампаніі. «Вынікі такіх аперацый, як правіла, самыя розныя», — растлумачыў Флемінг падчас свайго першага выступлення ў якасці кіраўніка GCHQ на канферэнцыі Cyber UK у Манчэстэры. «У 2017 годзе былі перыяды, калі «Ісламская дзяржава» практычна не магла распаўсюджваць сваю нянавісць праз інтэрнэт», — кажа Флемінг. У ходзе брытанскай кібераперацыі дзейнасць групоўкі ў інтэрнэце была падарваная, атрымалася знішчыць шэраг фізічных сетак і абсталявання. «Гэтая кампанія паказала, наколькі эфектыўным і накіраваным можа быць выкарыстанне кібермагутнасцяў для наступу», — кажа Флемінг.

ПУЭРТА-РЫКА ЗАСТАЛОСЯ БЕЗ СВЯТЛА 3-ЗА ПАДЗЕННЯ ДРЭВА

Жыхары Пуэрта-Рыка, уключаючы сталіцу Сан-Хуан, сутыкнуліся з маштабным адключэннем электрычнасці пасля таго, як дрэва, якое ўпала, пашкодзіла лінію электраперадачы, паведаміў тэлеканал CNN. Па словах мэра Сан-Хуана Кармэн Юлін, прыкладна 700 тысяч чалавек засталіся без святла, і на аднаўленне падачы электрычнасці спатрэбілася каля 16 гадзін. Некалькі іншых населеных пунктаў таксама сутыкнуліся з перабоямі з электразабеспячэннем.

КОШТ SPACEX НЕЎЗАБАВЕ ДАСЯГНЕ $25 МЛРД

Такія ацэнкі прывяло агенцтва Bloomberg. Яно канстатуе, што SpaceX такім чынам стане трэцяй у ЗША па кошце кампаніяй, заснаванай на інавацыях, якая пачынала як стартап. Першыя дзве — гэта папулярны анлайн-сэрвіс аўтамабільных перавозак Uber, які дазваляе праз праграму на мабільным тэлефоне скарыстацца паслугамі кіроўцаў прыватных аўтамабіляў, а таксама сеткавы рэсурс Airbnb, прызначаны для кароткатэрміновай арэнды жылля. Паводле звестак PitchBook Data, у лістападзе 2017 года кошт SpaceX ацэньваўся ў $21 млрд. Усяго SpaceX плануе ў 2018 годзе здзейсніць каля 30 запускаў. Летась ракеты гэтай кампаніі адпраўляліся ў космас 18 разоў.

КРЫПТАВАЛЮТЫ РАСТУЦЬ У ЦАНЕ

Кошт крыптавалют працягвае актыўна расці, аналітыкі адзначаюць, што гэта можа азначаць завяршэнне глыбокай карэкцыі, якая назіралася ў першым квартале 2018 года. Паводле звестак партала CoinMarketCap, учора біткойн даражэў на 12,39 % — да 7785 долараў. На біржы Bitfinex крыптавалюта расла ў цане на 13,33 % — да 7882 долараў, на OKEx — на 13,09 %, да 7860. У чацвер падчас таргоў біткойн упершыню за два тыдні дасягаў восем тысяч долараў на біржы Bitfinex. Даражэлі ў пятніцу і альтэрнатыўныя крыптавалюты: Ethereum — на 13 %, да 485,33 долара, Ripple — на 16,77 %, да 0,61 долара, Bitcoin Cash — на 8,53 %, да 731,6 долара. Капіталізацыя рынку крыптавалют, па інфармацыі CoinMarketCap, складае на цяперашні момант 271,2 мільярда долараў. Пры гэтым на долю біткойна прыпадае прыкладна 44 % усяго рынку крыптавалют.

■ Ведай нашых!

Біятэхналагічныя метады перамаглі

На алімпіядзе «Golden Climate» беларускія школьнікі заваявалі залатыя медалі.

Штогадовая міжнародная алімпіяда «Golden Climate» (GCIEPO) — самы вялікі міжнародны конкурс навуковых праектаў сярод школьнікаў. Усяго на алімпіядзе ў Найробі (Кенія) было прадстаўлена больш за 200 праектаў з 25 краін.

Беларусь у Найробі прадстаўляў праект на тэму «Павышэнне эфектыўнасці арганічнага і традыцыйнага земляробства біятэхналагічнымі метадамі». Яго аўтары — выхаванцы Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства дзесяцікласнік мінскай сярэдняй школы № 130 Цімафей ФЁДАРАЎ і адзінаццацікласнік сталічнай 13-й гімназіі Дзмітрый ХАРЫТОНАЎ. На міжнароднай алімпіядзе яны былі ўзнагароджаны залатымі медалямі і спецыяльнымі сертыфікатамі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ «Звязда» даследуе праблему

«МОЙ МІЦЯ ПРЫВЫК ЖЫЦЬ У ЛЮБОВІ...»

Ці ёсць альтэрнатыва дому-інтэрнату для дарослых дзяцей з цяжкай інваліднасцю?

Міцю 26 гадоў. Ён не размаўляе, не чытае і не ўмее лічыць — інтэлектуальныя парушэнні з прычыны пашкоджання галаўнога мозга. Кантактуе з навакольнымі хлопец пры дапамозе жэстаў, няўцямных гукаў і піктаграм. Пры гэтым ён мае кішэнныя грошы, больш за тое, сам іх зарабляе! Працуе прыбіральшчыкам плюс на паліграфічным абсталяванні на сталічным прадпрыемстве «Арт-ідэя» робіць паштоўкі. У яго нават ёсць мабільны тэлефон! Ён тэлефануе маме — тая выдатна разумее ўсе яго гукі. Больш за тое, Міця, не ўмеючы чытаць і пісаць, можа самастойна пакласці грошы на тэлефон у банкамаце (яго навучылі адрозніваць купюры). Іншымі словамі, хлопец добра сацыялізаваны. Адзінае пытанне, якое да самага апошняга часу моцна мучыла яго маці: што з ім будзе далей, калі не будзе яе? Бо, нягледзячы

ні на што, Міця ніколі не зможа жыць самастойна — ні ў 26 гадоў, ні ў 40...

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

БОЛЬШ, ЧЫМ СПАРТЫЎНЫ ІНТАРЭС

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Наконт лыжных гонак далажыў Андрэй Каваленка, старшыня Беларускай федэрацыі лыжных гонак. Ён адзначыў, што такое выступленне на Гульнях стала вынікам памылкі трэнерскага штаба: спартсмены прыйшлі выматанымі як фізічна, так і маральна. Новы падыход будзе ажыццяўляць новы трэнерскі штаб нацыянальнай каманды, будуць мінімізаваныя замежныя зборы, ёсць дамоўленасць аб трэніроўках на расійскіх базах. Прэзідэнт падкрэсліў, што з гэтай «ямы» трэба выбірацца. Кожнаму профільнаму спартыўнаму цэнтру да канца лета неабходна закуліць снегавыя пушкі і ратракі.

Аляксандр Лукашэнка, падводзячы вынікі, высока ацаніў барацьбу параалімпійцаў на Гульнях у Паўднёвай Карэі. «Лічыце, што я ваш адданы балельшчык», — сказаў Прэзідэнт. Адносна дзіцячага спорту, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што «ўсе павінны разумець: ніякіх поспехаў мы не дабʼёмся да таго часу, пакуль не створым эфектыўную сістэму выхавання атлетаў. Спартсмен — ключавое звяно. Менавіта ён, яго патрэбы і праблемы павінны быць у фокусе нашай увагі. Задача губернатараў — стварыць на месцах для дзяцей усе ўмовы, уцягнуць іх у заняткі спортам». Да гэтага важна падключыць і іх бацькоў.

Прэзідэнт паставіў задачу мець стратэгічную праграму па кожным відзе спорту на 10—15 гадоў. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што «старшыня федэрацыі сумесна з кіраўніком назіральнага савета і галоўным трэнерам нацыянальнай каманды — вось таксама «тройка», якая адказвае за развіццё канкрэтнага віду спорту. Прымайце неабходныя рашэнні ў рамках заканадаўства, у межах бюджэтнага фінансавання».

Надзея АНІСОВІЧ.

СТРАТЭГІЯ СЯЎБЫ

Каб эфектыўна правесці сяўбу на поўначы краіны, у прынцыпе ёсць усё неабходнае: угнаенні, тэхніка, паліва і гэтак далей. Кіраўніцтва Віцебскага аблвыканкама патрабуе строга прытрымлівацца тэхналогій. Гэта гарантыя таго, што паспяховая сяўба дасць добры ўраджай. Толькі б надвор'е не падвяло. Але аграрыі Віцебшчыны навучыліся працаваць у любых умовах.

Цяжкасці загартавалі

«Звязда» ўжо паведамляла, што на Віцебшчыне запланавалі сабраць не менш за 1,5 мільёна тон збожжавых.

Губернатар Мікалай ШАРСНЁЎ днямі сустракаючыся з аграрыямі, нагадаў, што надвор'е два апошнія гады ім вельмі перашкаджала.

— Працавалі ў жудасных умовах: дажджы, холад, пераўвільгатненне глебы і гэтак далей. Але цяжкасці нас загартавалі, — адзначыў старшыня Віцебскага аблвыканкама.

Паабяцаў зацікавіць механізатараў добрай зарплатай. У прыватнасці, за перавыкананне нормы плануецца падвоеная аплата. Сёлета да людзей давядуць адпаведную інфармацыю, каб ведалі, за што і колькі атрымаюць грошай. Але, канешне, гектары трэба апрацаваць якасна. Інакш прэміі не будзе.

Старшыня камітэта эканомікі Віцебскага аблвыканкама Анжаліка НІКІЦІНА ўдакладніла, што цяпер расцэнкі будуць зразумелыя любому механізатару...

На дапамогу прыйдуць навучэнцы, гараджане

Гэтымі днямі на палях будзе «высаджаны» вялікі маладзёжны «сельскагаспадарчы дэсант». У «Сяўбе-2018» возьмуць удзел больш за тысячу навучэнцаў каледжаў сельскагаспадарчага профілю, якія змогуць працаваць у якасці трактарыстаў-машыністаў у 99 перадавых гаспадарках.

Паводле слоў **начальніка ўпраўлення адукацыі Віцебскага аблвыканкама Дзмітрыя ХАМЫ,** хлопцы здалі адпаведныя экзамены, прайшлі інструктаж па тэхніцы бяспекі і ахове працы. За імі замацаваны вопытныя педагогі. Аператыўна вырашаюцца пытанні харчавання, пражывання і падвозу.

Дарэчы, у гэтым навучальным годзе павялічылі колькасць гадзін для праходжання вытворчай практыкі. Навучальны план зменены.

Аграрыям у сяўбе дапамогуць і жыхары райцэнтраў і буйных гарадоў — каля 800 механізатараў, якія раней не прымалі ўдзелу ў пасяўных работах.

Старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага аблвыканкама Іван ФЁДАРАЎ настойвае: трэба сяўбу праводзіць у адпаведнасці з тэхналогіяй. Нагадаў, што неабходна і ўборка ад камянёў, з-за якіх нярэдка псуецца тэхніка. На збор «каменнага ўраджаю» трэба актыўней прыцягваць беспрацоўных, усіх, хто жадае папрацаваць...

Фермеры могуць зацікавіцца

На абласным семінары-нарадзе па актуальных пытаннях развіцця аграрна-прамысловага комплексу кіраўнікі ўлады канстатавалі, што ёсць усе падставы, каб стала больш фермераў.

На сёння на Віцебшчыне каля 390 адпаведных прыватных гаспадарак. Ім гарантуюцца шматлікія дзяржаўныя прэферэнцыі. Напрыклад, можна купіць тэхніку ў лізінг, існуюць вельмі прывабныя ўмовы крэдытавання, як і падаткі.

На думку губернатара, адзін з сельскагаспадарчых напрамкаў, дзе могуць добра зарабляць фермеры, — развядзенне авечак, мясная жывёлагадоўля. Тым больш што ёсць магчымасць не ехаць за межы вобласці, каб прадаць тавар. У прыватнасці, воўна неабходна для Віцебскага футравага камбіната, мяса — для вытворчасці дзіцячага харчавання на Аршанскім мясакамбінаце.

Зямлі для выпасу жывёлы ў вобласці больш чым дастаткова, бо нямала так званых дробнаконтурных плошчаў, якія не задзейнічаны.

Толькі лічбы. Напрыканцы цікавая лічба: адзін работнік сельскай гаспадаркі забяспечвае працай 10 гараджан, якія займаюцца перапрацоўкай, рэалізацыяй прадукцыі і іншым. Таму чарговая сяўба — гэта справа, у паспяховай рэалізацыі якой зацікаўлены ўсе. У АПК на Віцебшчыне працуе каля 10 % ад усіх занятых у эканоміцы — прыблізна 48 тысяч чалавек.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ДЫПЛАМАТЫЯ ШЫРОКАГА СПЕКТРА

КРАІНА TERRA INCOGNITA

— Якім чынам, на ваш погляд, можна развіваць беларуска-партугальскае супрацоўніцтва?

— Партугалія — краіна, якая знаходзіцца на захадзе еўрапейскага кантынента, у якой пражывае каля 10 мільёнаў насельніцтва, — мае багатую гісторыю. Апошнім часам гэта дзяржава перажывала розныя эканамічныя сітуацыі, але патэнцыйна яе рынак можа быць запатрабаваны з пункту гледжання паставак беларускай прадукцыі. Зразумела, што адным з галоўных эканамічных партнёраў Беларусі з'яўляецца Расія, але другі партнёр — гэта Еўрапейскі саюз у цэлым. Рынак апошняга складаецца як з агульнага, так і з рынкаў асобных краін-удзельніц. І Партугалія — той нявыкарыстаны патэнцыял, які мы павінны ўлічваць пры прасоўванні беларускіх тавараў.

Дзеля таго каб дасягнуць гэтых мэт, мы павінны ажыццяўляць сістэмныя дзеянні, накіраваныя на развіццё эканамічных адносін. Фактычна Партугалія як назва вядомая беларусам, але як краіна застаецца terra incognita, таму што з ёй мы не падтрымлівалі актыўных стасункаў з моманту ўсталявання дыпламатычных адносін. І тое, што ў мінулым годзе мы правялі першыя палітычныя кансультацыі на ўзроўні намеснікаў міністраў замежных спраў, тое, што ў гэтыя дні праводзім другі раўнд кансультацый, сведчыць аб агульнай зацікаўленасці Беларусі і Партугаліі ў інтэнсіфікацыі супрацоўніцтва.

Палітычныя кансультацыі — гэта толькі рамкі, падмурак для рэалізацыі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Інстытут Камоенса.

канкрэтных кірункаў і праектаў. Іх вынікам павінна стаць развіццё эканамічных адносін. Рэалізацыі мэты, безумоўна, павінны служыць і эканамічныя форумы. Некаторы час таму мы правялі першы беларуска-партугальскі бізнес-форум у Порту, які разам з Лісабонам з'яўляецца найбуйнейшым эканамічным цэнтрам краіны. Таксама адзначу, што адбыўся першы ў гісторыі нашых краін форум у Манака.

— Калі адбудзецца наступны сумесны форум з Партугаліяй?

— Плануем найбліжэйшым часам правесці эканамічны форум у Лісабоне сумесна з Агенцтвам па падтрымцы эканамічнага супрацоўніцтва Партугаліі. Мы зацікаўлены ў тым, каб дэлегацыя дзелавых колаў гэтай краіны наведала Беларусь. У гэтыя дні ў Лісабоне падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве ў гандлёва-эканамічнай сферы, якое з'яўляецца базавым пагадненнем для развіцця эканамічных адносін, стварае вельмі важны інструмент развіцця двухбаковага ўзаемадзеяння — гандлёва-эканамічную камісію. Дарэчы, пасольства Беларусі ў Парыжы, якое адказвае за адносіны яшчэ і з Францыяй і Іспаніяй, забяспечыла падпісанне трох пагадненняў у эканамічнай сферы з гэтымі краінамі, а таксама стварэнне адмысловых двухбаковых камісій, якія з'яўляюцца класічным інструментам эканамічных адносін і маюць свой плён. На базе камісій мы ствараем і будзем ствараць рабочыя групы.

Вельмі важна, што мы падпісалі пагадненне аб палітычным супрацоўніцтве. Гэта імпульс — у тым ліку для дзелавых колаў дзвюх краін, — што ўрады гатовы падтрымліваць шырокамаштабнае развіццё адносін на двухбаковым узроўні, а таксама сігнал аб узаемным спрыянні нашым адносінам з Еўрасаюзам. З іншага боку, мы гатовы аказваць садзейнічанне Партугаліі ў супрацоўніцтве з Еўразійскім эканамічным саюзам. Вельмі важным з'яўляецца пашырэнне дагаворна-прававой базы супрацоўніцтва, мы абмяркоўваем з партугальскім бокам падпісанне пагадненняў аб узаемнай абароне інвестыцый, аб пазбяганні падвоенага падаткаабкладання, аб супрацоўніцтве ў транспартнай і турыстычнай сферах. Дарэчы, Партугалія — адзін з лідараў у Еўропе па развіцці турыстычнай сферы, якую Беларусь вызначыла ў якасці аднаго з прыярытэтаў у развіцці эканамічнай палітыкі, партугальскі досвед тут можа сапраўды нам дапамагчы. Усё гэта — базавыя элементы, якія забяспечаць большую выніковасць у нашых адносінах.

ПРАЗ ЕЎРОПУ... У АФРЫКУ?

— Ці можна выкарыстаць нашы адносіны з Еўрасаюзам дзеля выхаду беларускіх тавараў у Афрыку ці Лацінскую Амерыку?

— Так, прыкладам можа стаць развіццё адносін з Францыяй. У мінулым годзе ў Парыжы адбыўся беларуска-французска-афрыканскі бізнес-форум, у якім прынялі ўдзел каля ста прадстаўнікоў дзелавых колаў такіх афрыканскіх краін, як Камерун, Сенегал, Кот-д'Івуар і іншых, а таксама прадстаўнікі французскіх кампаній і 17 беларускіх прадпрыемстваў у сферы машынабудавання. Цікава, што дзякуючы падобнаму мерапрыемству, непасрэдным кантактам французаў з прадстаўнікамі афрыканскіх кампаній мы ствараем магчымасці па прасоўванні машынабудаўнічай прадукцыі беларускіх прадпрыемстваў на рынкі афрыканскіх краін.

Галоўнай нагодай для гэтага з'яўляюцца гістарычныя сувязі паміж Францыяй і афрыканскімі дзяржавамі. Прыклад, які пераканаў, мы можам выкарыстоўваць у рамках супрацоўніцтва з Іспаніяй: яна мае даволі значны ўплыў на рынках краін Лацінскай Амерыкі. Дарэчы, гэта пытанне стала адным з галоўных падчас пасяджэння міжурадавай беларуска-іспанскай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, якое адбылося ў канцы мінулага года ў Мінску. І такое пытанне можа стаць прадметам абмеркавання падчас пасяджэння камісіі паміж Беларуссю і Партугаліяй, бо апошняя мае глыбокія сувязі з шэрагам афрыканскіх краін.

З другога боку, партнёрам у Францыі, Іспаніі і Партугаліі мы можам прапанаваць выкарыстоўваць магчымасці нашай краіны ў прасоўванні сваёй прадукцыі ў ЕАЭС праз стварэнне вытворчасці на тэрыторыі саюза, дзе пражывае 180 мільёнаў насельніцтва. Таму тут мы бачым скрыжаванні інтарэсаў, якія могуць прынесці карысць нашым краінам.

— Расія стала адмаўляцца ад нашага малака, а Еўропа не адчувае дэфіцыту ў гэтым прадукце. На якія краіны нам можна звярнуць увагу ў гэтым пытанні? Ці сапраўды трэба пераарыентавацца ў такіх сітуацыях альбо лепш шукаць паразумення з цяперашнімі партнёрамі?

— Зразумела, што расійскі рынак з'яўляецца адным з самых галоўных для паставак прадукцыі сельскагаспадарчай галіны для беларускіх прадпрыемстваў. Гэта рынак, які ўяўляе вялікую цікавасць для нас, наша прадукцыя там вядомая, неаднойчы асабіста чуў высокую ацэнку грамадзян Расіі яе якасці, і яна бясспрэчна з'яўляецца запатрабаванай.

Разам з тым адным з галоўных прыярытэтаў знешняй палітыкі Беларусі з'яўляецца дыверсіфікацыя экспарту. Рэалізацыя стратэгіі, якая была абвешчана некаторы час таму знешнепалітычным ведамствам нашай краіны, вельмі важная. Размова пра неабходнасць працы па трох напрамках: першы — ЕАЭС у цэлым і Расія. Другі — развіццё адносін з Еўрапейскім саюзам, гэты рынак дэ-факта і патэнцыйна можа мець яшчэ большае запатрабаванне на прадукцыю беларускіх прадпрыемстваў. Трэці — рынак іншых дзяржаў свету.

Мы знаходзімся на лініі паміж Захадам і Усходам, залежым ад экспарту. Рэалізацыя падобнай стратэгіі з'яўляецца нашым галоўным прыярытэтам. Такая экспартная палітыка забяспечвае стратэгічныя інтарэсы нашай краіны — бяспеку яе эканамічнага развіцця.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

■ Навука

АГРАРНЫ ПРАГРЭС

Вучоныя краіны спрабуюць перавесці камбайны на работу за кошт электрычнасці. Такая неабходнасць з'явілася ў сувязі з хуткім уводам у строй беларускай АЭС. Акрамя таго, для патрэб сельскай гаспадаркі плануецца выкарыстоўваць беспілотнікі і дроны. Не менш цікавыя дасягненні і планы ў нашых вучоных у сферы селекцыі і жывёлагадоўлі. Усе гэтыя крокі павінны ўмацаваць харчовую бяспеку краіны ў найбліжэйшай будучыні.

Камбайны на электрычнасці і дроны на полі

Як расказаў **вучоны сакратар Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі Юрый САЛАПУРА,** сёння вядуцца работы па электрыфікацыі рабочых органаў сельскагаспадарчых машын. Для аграрыяў гэта можа стаць перспектыўнай тэхналогіяй у сувязі з тым, што ў 2019 годзе плануецца ўвядзенне першага энергаблока АЭС. Перад навукоўцамі стаіць задача распрацаваць прынцыпы, якія дазволяць адысці ад гідраўлікі.

Паводле слоў Юрыя Салапуры, ужо ёсць станоўчыя вынікі. Аднак пакуль у навукова-практычным цэнтры вядзецца работа па электрыфікацыі невялікіх сельскагаспадарчых машын у сферы агародніцтва. Так, распрацаваны самаходны агрэгат для збору пладовых і ягадных культур. Што да буйных камбайнаў, у гэтым напрамку актыўна працуе «Гомсельмаш». Работы па электрыфікацыі машын, каб максімальна выключыць чалавечы фактар і перайсці на поўную аўтаматызацыю тэхналагічных працэсаў, вядуцца над сельгастэхнікай па нарыхтоўцы кармоў і ўборцы ўраджаю.

Акрамя электрыфікацыі машын, для патрэб сельскай гаспадаркі плануецца выкарыстоўваць беспілотнікі і дроны. Развіваецца і кірунак рабатызацыі. Даільныя робаты выкарыстоўваюцца сёння на многіх фермах краіны. «Цяпер мы працуем па рабатызацыі ў раслінаводстве», — рэзюмаваў навуковец.

Насенная бульба вяртае рынкі

Намеснік гендырэктара па навуковай рабоце Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па бульбаводстве і плодаагародніцтве Вадзім МАХАНЬКО расказаў, што беларуская насенная бульба вяртаецца на рынкі, якія былі да 1991 года. Бульба беларускіх сартоў паспяхова расце на палях ад Брэста да Сахаліна. Пры гэтым насенная бульба застаецца важным артыкулам беларускага экспарту ў Расію, Казахстан, Узбекістан, Грузію.

У Беларусі айчынныя сарты на працягу 30 гадоў займаюць каля 70 % пасадачных плошчаў. Самыя распаўсюджаныя з іх «Брыз» і «Скарб», не менш папулярнымі становяцца новыя сарты «Рагнеда», «Маніфест», «Лель».

Па словах Вадзіма Маханько, нягледзячы на тое, што мінулы сезон для многіх гаспадарак быў няпросты, у краіне ўраджайнасць бульбы ўпершыню наблізілася да паказчыка 300 ц/га. Але гэта не мяжа. Акрамя таго, ідзе паступовы пераход ад сартавой селекцыі да селекцыі гібрыдаў першага пакалення, якія маюць значна большую ўраджайнасць і лепш захоўваюцца.

Вырашаць праблему пагалоўя

Селекцыйна-генетычныя цэнтры ў сферах малочнай, мясной жывёлагадоўлі і свінагадоўлі будуць створаны ў Беларусі і Расіі па праграме Саюзнай дзяржавы. **Намеснік генеральнага дырэктара па навуцы Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па жывёлагадоўлі Аляксандр БУДЗЕВІЧ** адзначыў, што колькасці племяннога пагалоўя ў нашай краіне не хапае, таму ідзе работа над праграмай у рамках Саюзнай дзяржавы.

Праграма прадугледжвае таксама стварэнне інфармацыйна-аналітычнай базы агульных папуляцый жывёл, павышэнне дакладнасці ацэнкі жывёл шляхам выкарыстання ДНК-тэхналогій і біятэхналогій.

Работа над праграмай пачалася практычна два гады таму. Заказчыкамі выступаюць Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі і Міністэрства сельскай гаспадаркі Расіі. Распрацоўшчыкі — Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па жывёлагадоўлі і Усерасійскі навукова-даследчы інстытут племяннной справы.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

Маршруты на Радаўніцу

Паўночныя, Міханавіцкія, Каладзішчанскія, Заходнія могілкі каля сталіцы ў апошнія дзесяцігоддзі сталі месцам спачыну для дзясяткаў тысяч людзей. 17 красавіка адзначаецца Радаўніца — дзень памінання памерлых. І паўстае пытанне — як наведаць месцы іх пахавання?

— Што да буйных могілак накшталт Паўночных, то каля іх будзе зменена арганізацыя дарожнага руху, — паведаміў **старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС Станіслаў САЛАВЕЙ.** — Азнаёміцца з часовымі схемамі можна будзе на сайце Міністэрства ўнутраных спраў. На могілках меншых памерамі будуць дзяжурыць супрацоўнікі ДАІ. Яны дапамогуць тым, хто прыехаў на месца спачыну родных і блізкіх, правільна расставіць транспарт, каб не замінаць астатнім. Разам з тым мы назіраем у апошнія гады добрую з пункту гледжання бяспекі дарожнага руху сітуацыю. Калі раней большасць людзей кіравалася туды менавіта на Радаўніцу, то цяпер многія карыстаюцца доўгімі выхаднымі і едуць на могілкі падчас іх. Такім чынам, плынь размяркоўваецца больш раўнамерна, і нагрузка на дарожную сетку становіцца меншай.

А наколькі зручна будзе арганізавана магчымасць дабрацца на месцы пахаванняў на грамадскім транспарце?

— 17 красавіка на лінію будуць выведзены дадатковыя 240 аўтобусаў, — зазначыў **начальнік аддзела пасажырскіх перавозак ДУ «Сталічны транспарт і сувязь» Аляксандр КАПЦЮХ.** — Але і ў дні, якія папярэднічаюць Радаўніцы, будуць арганізаваны дадатковыя аўтобусныя маршруты. Даехаць на іх можна будзе да ўсіх месцаў пахавання, якія знаходзяцца паблізу сталіцы. Акрамя таго, непасрэдна ў Мінску забяспечым падвоз людзей да прыпынкаў, адкуль будзе адпраўляцца транспарт да могілак. Трасы маршрутаў, пункты пасадкі і высадкі ў нас звыклыя. Пасажыры ў іх арыентуюцца добра. Таму праблемы даехаць да месцаў пахавання не будзе.

Акрамя таго, БЧ прызначае на 14—17 красавіка дадатковыя 45 міжрэгіянальных цягнікоў. Саставы рэгіянальных ліній эканом-класа ў гэты час будуць курсіраваць па графіку выхадных дзён.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

■ Тарыфы

З суботы зноў даражэе бензін

Чарговае падаражанне аўтамабільнага паліва адбудзецца ў нашай краіне, пры гэтым дызель патаннее, інфармуе прэс-служба «Белнафтахіма».

У ведамстве паведамілі, што рознічныя цэны на дызельнае паліва зніжаюцца на 1 капейку, на аўтамабільны бензін — павялічваюцца на 1 капейку. З 14 красавіка кошт 1 літра бензіну AI-92-K5-Еўра складзе 1 рубель 27 капеек, AI-95-K5-Еўра — 1 рубель 35 капеек, AI-98-K5-Еўра — 1 рубель 56 капеек, ДП — 1 рубель 36 капеек.

Апошні раз цана на паліва змянялася 4 красавіка: бензін і дызпаліва тады падаражалі на 1 капейку.

Сяргей КУРКАЧ

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
по объекту: «Район жилой усадебной застройки деревни Зацень». 4-й пусковой комплекс. 1-я очередь строительства. Комплексная жилая застройка участка по ул. Зацень, 6»

Сведения о застройщике.
Государственное предприятие "УКС Центрального района г. Минска" решением Мингорисполкома № 2292 от 18.11.2004 зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190580566. Юридический адрес: 220035, г. Минск, ул. Гвардейская, д. 7. Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.45 до 16.45. Обеденный перерыв с 13.00 до 14.00.

Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет Застройщиком построены и введены в эксплуатацию объекты:
– жилой дом № 20 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 40 месяцев;
– жилой дом № 12 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 24 месяца;
– жилой дом № 14 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 47 месяцев;
– жилой дом № 8 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 15 месяцев;
– жилой дом № 10 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 13 месяцев;
– жилой дом № 16 по ул. Мястровская, фактический срок строительства – 20 месяцев;
– жилой дом № 29 по ул. Мястровская, фактический срок строительства – 18 месяцев;
– жилой дом № 3А по ул. Нововиленская, фактический срок строительства – 7 месяцев;
– жилой дом № 7Б по ул. Нововиленская, фактический срок строительства – 9 месяцев;
– малоэтажные жилые по ул. Зацень 45А, 45Б, 45В, фактический срок строительства – 5 месяцев;
– жилой дом № 123 по пр. Победителей, фактический срок строительства – 27 месяцев;
– жилой дом № 37А по ул. Каховская, фактический срок строительства – 52 месяца;
– жилой дом № 121 по пр. Победителей, фактический срок строительства – 18 месяцев;
– жилой дом № 15 по ул. Павлины Меделки, фактический срок строительства – 9 месяцев;
– жилой дом № 5 по ул. Павлины Меделки, фактический срок строительства – 10 месяцев;
– жилой дом № 20 по ул. Выготского, фактический срок строительства – 12 месяцев;
– жилой дом № 7 по ул. Павлины Меделки, фактический срок строительства – 8 месяцев.

Цель строительства района жилой усадебной застройки деревни Зацень, 4-го пускового комплекса, 1-й очереди строительства, комплексной жилой застройки участка по ул. Зацень, 6, общей площадью проектируемых жилых 7 516 кв. м – увеличение уровня обеспеченности населения жильем.

Строительство осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.
Начало строительства объекта – декабрь 2016.
Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию объекта (согласно ПОС) – декабрь 2018.

Решения местного исполнительного и распорядительного органа о процентном соотношении строящихся граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, не принимались.

По проектно-сметной документации получено положительное заключение РУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» от 01.08.2016 № 449-15/16, от 07.04.2017 № 91-15/17, от 26.07.2017 № 515-15/17.

Земельный участок передан Государственному предприятию «УКС Центрального района» решением Мингорисполкома от 08.09.2016 г. № 2596.

Получено разрешение Госстройнадзора от 22.12.2016 г., 27.02.2017, 28.03.2017 № 2-209Ж-054/16.

Генеральный подрядчик – ОАО «Стройтрест № 1» (договор генподряда № 15 от 02.12.2016).

В коммунальную собственность г. Минска для переселения граждан из жилых домов, подлежащих сносу в связи с предоставлением земельных участков под жилищное строительство, безвозмездно передается 6,7 % общей жилой площади.

В состав объекта «Район жилой усадебной застройки деревни Зацень». 4-й пусковой комплекс. 1-я очередь строительства. Комплексная жилая застройка участка по ул. Зацень, 6 входят:
– блокированные жилые дома на 2 квартиры № № 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7 по генплану;
– блокированные жилые дома на 8 квартир № № 8, 9, 10,11 по генплану;
– усадебные жилые дома № № 12, 13, 22, 25, 26, 27 по генплану;
– блокированный жилой дом на 5 квартир № 15 по генплану.

Проектируемые жилые одноквартирные и блокированные дома расположены на территории района усадебной застройки Зацень.

Усадебные жилые дома № № 12, 13, 22, 25, 26, 27 по генплану.

Усадебный жилой дом запроектирован двухэтажным в жилой части здания, одноэтажным в части помещения хранения автомобиля. Здание без подполья, с холодным не эксплуатируемым чердаком, кровля стропильная скатная с организованным наружным водостоком. Размеры в крайних осях 12,65х7,0 м. Высота первого этажа жилой части – 3,0 м, второго этажа – 2,7 м (от пола до потолка). Отметка конька кровли – 8,83 м.

В жилом доме предусмотрены помещения: на 1-м этаже – холл (гостиная), кухня, санузел, мини-котельная, тамбур, гараж на 1 машиноместо; на 2-м этаже – три спальни, санузел, холл. **Часть межкомнатных перегородок показана условно как вариант планировки.**

Связь между этажами осуществляется по внутриквартирной лестнице. Встроенная мини-котельная запроектирована с отдельным входом (со стороны дворового фасада) и окном.

Наружные стены жилой части здания предусмотрены из керамзитобетонных блоков, толщиной 400 мм с утеплением.

Внутренние перегородки запроектированы из пустотелого кирпича, толщиной 120 мм, в помещениях с влажным режимом – из полнотелого.

Окна приняты ПВХ с заполнением двухкамерными стеклопакетами (расчетное сопротивление теплопередаче не менее 1,0 кв. м град С/Вт). Наружные двери – стальные.

Наружная отделка:
– стены, цоколь – декоративно-защитный состав;
– окна – заводская отделка;
– металлические элементы фасадов, кровля – заводская отделка;
– ограждение крылец – нержавеющая сталь;
– облицовка ступеней – глазурованная клинкерная плитка.

Внутренняя отделка – проектом предусмотрена черновая подготовка под финишную отделку, установка внутриквартирных дверей не предусмотрена.

Квартиры для проживания инвалидов проектом не предусмотрены.

В каждом здании запроектированы системы хозяйственно-питьевого холодного и горячего водоснабжения и бытовой канализации.

Источником теплоснабжения жилых домов являются двухконтурные газовые котлы.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются 2 (два) усадебных жилых дома общей площадью 139,38 кв.м, стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном 1 000 (одна тысяча) долларов США при единовременной уплате цены договора (100%). При поэтапной уплате в установленный договором период по графику платежей – в размере, эквивалентном 1100 (одна тысяча сто) долларов США.

Условия оплаты. Обязательство дольщика по уплате цены объекта долевого строительства (цены договора) исполняется в белорусских рублях в сумме, эквивалентной долларам США. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком на день платежа на специальный и расчетный счета застройщика: при оплате по графику – первоначальный взнос в размере 30 % стоимости объекта долевого строительства вносится в течение 15 (пятнадцати) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма оплачивается в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору. При единовременном платеже – 100 % стоимости объекта долевого строительства – в течение 15 (пятнадцати) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме.

При заключении договора с гражданином, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, необходимо:
— личное присутствие гражданина или его представителя, наличие паспорта или доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Документы для заключения договоров будут приниматься с 20 апреля 2018 года **по адресу: г. Минск, ул. Гвардейская, 7.**

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных помещений.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве считается не поданным и застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное помещение с другим претендентом.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента заключения договоров создания объекта долевого строительства на все количество продекларированных помещений.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству можно по адресу: **г. Минск, ул. Гвардейская, д. 7, каб. 111, тел.: 306-07-26, 8 029 311-15-15**

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Мирополье» (продавец), проводит открытый аукцион по продаже **автогаража с инвентарным номером № 610/С-59342 общей площадью 848,3 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 620887400001000787 площадью 0,6690 га по адресу: Минская область, Борисовский район, Пригородный с/с, 3, район д. Житьково.** *На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: охранная зона электрических сетей площадью 0,0050 га.*

Условия продажи:
- улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка, в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества;
- поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);
- обращение в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество (в случае отчуждения незарегистрированного объекта – с даты подписания акта приема-передачи) в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ (в случае необходимости ее разработки) либо информирование соответствующего исполнительного комитета в указанный срок об отсутствии такой необходимости;
– разработка проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством;
– проведение реконструкции (строительства) недвижимого имущества в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2 лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество, если иное не установлено решением районного исполнительного комитета;
– использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством;
– запрет на отчуждение недвижимого имущества до его ввода покупателем в эксплуатацию.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 130 380,30 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – 13 038,00 бел. руб.)

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **15.05.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.05.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

«МОЙ МІЦЯ ПРЫВЫК ЖЫЦЬ У ЛЮБОВІ...»

«Суседзі спачатку цураліся сына, а цяпер жартуюць, што зробяць яго швейцарам...»

Гэтае пытанне мучыць і тысячы іншых людзей — бацькоў такіх жа дзяцей. Усе яны баяцца, што іх сын (ці дачка) рана ці позна трапіць у інтэрнат.

Уявіце сваё жыццё ў пакоі, дзе ад 4 да 6 чалавек, прычым у дарослым інтэрнаце побач могуць жыць малады мужчына з інваліднасцю, які трапіў туды, калі яму споўнілася 18 гадоў, дзядуля з дэменцыяй, алкаголік або наркаман з рознымі расстройствамі... І вы ніколі больш не спытаеце: а чым яму будзе дрэнна ў інтэрнаце? І нават калі там створаны ідэальныя ўмовы — усё роўна ў інтэрнаце вы жывяце з тым, з кім, магчыма, не хацелі б жыць, снедаеце тым, што не хацелі б есці, паднімаецеся ранкам тады, калі, можа, не хацелі б уставаць. Вы цалкам залежны чалавек, і вашага меркавання ніхто не пытаецца...

Месяц знаходжання дзіцяці ў доме-інтэрнаце абыходзіцца нашай дзяржаве ў 1018 рублёў. Кошт утрымання дарослага чалавека ў доме-інтэрнаце агульнага тыпу складае каля 767 рублёў, у псіханеўралагічным доме-інтэрнаце — каля 600 рублёў у месяц.

«Мой Міця прывык жыць у любові, — кажа Алена, яго маці. — У яго ёсць уласны пакой, свой гардэроб. Яго ведаюць усе суседзі, ён сам ходзіць у краму, ездзіць па горадзе з суправаджэннем. Мы з ім наведваем кафэ, удзельнічаем у розных спартыўных мерапрыемствах»...

Будзем шчырымі, калі вы ніколі не сутыкаліся з такімі людзьмі раней, першай вашай рэакцыяй будзе, скажам так, некаторая насцярожанасць... Але дастаткова крыху паназіраць за імі, паспрабаваць паразмаўляць — і ўсе апасенні, як правіла, развейваюцца, нібы раніш-ні туман над раллёй.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Майго сына ні разу не пакрыўдзіў ні адзін сусед, яму ніколі не сказалі дрэнната слова ў краме, — кажа Алена. — Чаму я гэта ведаю? Таму што ён бы спалохаўся і больш туды не пайшоў бы. Але я з суседзямі спачатку вельмі шмат размаўляла. Так, яны па першым часе цураліся майго Міці. Але я ім тлумачыла: мой сын не размаўляе, не чытае, не піша. Але ён усё разумее, яго завуць Міця... І ён вітаецца з усімі, заўсёды адкрые дзверы ў пад'ездзе, калі хто ідзе, выкліча ліфт... Суседзі жартуюць, што зробяць яго швейцарам».

У 1991 годзе, калі нарадзіўся Міця, Алене прапанавалі здаць яго ў інтэрнат. Тады было так: альбо мама здае дзіця, якое нарадзілася з цяжкімі парушэннямі, туды, альбо сядзіць з ім дома, паставіўшы на сваім жыцці крыж. Алену не задаволіў ні адзін з гэтых варыянтаў. Міцю наогул пашанцавала, таму што яго мама аказалася не проста любячай і самаадданай, але і з актыўнай жыццёвай пазіцыяй.

Цяпер яна, мабыць, адна з самых вядомых асоб сярод такіх жа бацькоў, а таксама прафесіяналаў, што займаюцца згаданай праблемай, і актывістаў грамадскіх арганізацый. Алена Цітова стаяла ля вытокаў і ўжо шмат гадоў з'яўляецца старшынёй «Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам» («БелАДДІіМІ») — грамадскай арганізацыі, што аб'ядноўвае каля 3000 сем'яў, у якіх жывуць дзеці і маладыя людзі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

«Мы першымі ў краіне стварылі цэнтр для дзяцей-інвалідаў, якія лічыліся ненавучаемымі. Паралельна лабіравалі адкрыццё аналагічных па ўсёй рэспубліцы, а пачынаючы з 2000-х Цэнтры карэкцыйна-развівальнага навучання (ЦКРН) адкрыліся па ўсёй краіне, — расказвае Алена Цітова. — Пры іх адкрыліся класы, дзе маглі займацца дзеці з самымі цяжкімі парушэннямі. Зараз ужо ёсць і інтэграваныя групы. І ў аддзяленнях дзённага знаходжання дарослыя інваліды (1—2 групы, як правіла, з разумовымі абмежаваннямі) не сядзяць невылазна ў чатырох сценах»...

Дом-інтэрнат — ужо не адзінае выйсце

Вядома, людзі з разумовымі абмежаваннямі да канца жыцця маюць патрэбу ў суправаджэнні. Хоць бы таму, што нават з лёгкай ступенню абмежаванняў яны — патэнцыйныя ахвяры самых разнастайных ашуканцаў. Дамы-інтэрнаты і ўзніклі калісьці з мэтай абараніць такіх людзей. Тым не менш ужо 50—60 гадоў назад у Еўропе вялікія дамы-інтэрнаты сталі зачыняцца. Вядома, сваю ролю тут адыгралі гуманныя меркаванні, але ўсё ж на першым месцы стаялі эканамічныя прычыны.

Утрымліваць чалавека ў інтэрнаце — гэта заўсёды дорага. Так, паводле звестак Міністэрства працы і сацабароны, месяц знаходжання дзіцяці ў доме-інтэрнаце абыходзіцца нашай дзяржаве ў 1018 рублёў. Кошт утрымання дарослага чалавека ў доме-інтэрнаце агульнага тыпу складае каля 767 рублёў, у псіханеўралагічным доме-інтэрнаце — каля 600 рублёў у месяц. Калі такі чалавек жыве ў сям'і, то дапамога па доглядзе інваліда першай групы (пры гэтым чалавек, які яго даглядае, не мае права працаваць) і пенсія па інваліднасці складаюць, па словах Алены Цітовай, у суме каля 443 рублёў. Пагадзіцеся, розніца ёсць.

Гэта ўжо разумее і дзяржава. З 2013 года ў нас у краіне з'явілася такое паняцце, як «суправаджальнае пражыванне інвалідаў». А ў апошнія гады пры ТЦСАН сталі адкрывацца аддзяленні суправаджальнага пражывання.

«Цяпер, напрыклад, пажылая мама-пенсіянерка, якой ужо цяжка самой даглядаць такога сына, можа патэлефанаваць туды і сказаць: мне складана завесці яго ў паліклініку або прыгатаваць для яго абед... Заключаецца дагавор, і сацработнік будзе ажыццяўляць элементы таго догляду, які раней ажыццяўлялі бацькі, — кажа Алена Цітова. — Я лічу, што гэта самы лепшы шлях. Людзі з інваліднасцю застаюцца ў звыклым асяроддзі, дзе іх усе ведаюць. Калі вяртацца да майго сына... Дапусцім, нас з мужам не стане. Тады сацработнік дапаможа арганізаваць яму побыт».

У цэнтры — Міця ЦІТОЎ.

Фота Алены ЦІТОВАЙ.

Наступным крокам, які, на думку Алены Цітовай, зробіць гэтую дапамогу больш таннай, стане аб'яднанне 5—7 такіх чалавек у адной вялікай кватэры. Людзі рознага ўзроўню інтэлектуальных парушэнняў змогуць жыць разам у суправаджэнні сацработніка і дапамагаць адзін аднаму.

* * *

— Скажыце, ці не будуць пры гэтым у нейкай ступені ўшчэмленыя правы іншых, каму, можа быць, будзе некамфортна жыць па суседстве з такой кватэрай? — задаю пытанне Алене Цітовай.

— У Германіі, напрыклад, калі дзесьці адкрывалася такая кватэра ці будаваўся дом, у першую чаргу расказвалі суседзям, якія і з якімі парушэннямі людзі будуць там пражываць. І што яны — не небяспечныя, не заразныя і г. д. Больш за тое, ім даваўся тэлефон арганізацыі, якая суправаджае пражыванне такіх людзей, і прасілі ў любой хвалюючай сітуацыі тэлефанаваць. Дарэчы, такое інфармаванне праводзілася яшчэ і з мэтай знайсці добраахвотных памочнікаў сярод суседзяў.

Наогул, суседзі — гэта самая галоўная сіла пры суправаджальным пражыванні. І замежны вопыт, і вопыт нашай арганізацыі паказвае, што калі ўсё растлумачыць, то яны не толькі не супраць такога пражывання, але і імкнуцца дапамагчы гэтым людзям.

* * *

«Бацькам асаблівых дзяцей вельмі важна прывучыць іх да як мага большай самастойнасці. Так, іх дзеці, нават стаўшы дарослымі, заўсёды будуць мець патрэбу ў суправаджэнні. Пытанне — наколькі яно будзе вялікае», — лічыць Алена Цітова.

